Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

№ 4(46) 2005

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія

Змест

Галоўны рэдактар:
П. Дз. Кухарчык

Рэдакцыйная калегія:
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
І. Я. Левяш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Новік
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
В. Б. Таранчук
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. С. Цернавы
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
М. Г. Ясавееў

Гісторыя

Пуцік У. С. Таварыствы сельскай гаспадаркі Паўночна-Заходняга краю ў канцы XIX — пачатку XX ст. (агляд матэрыялаў пасяджэнняў) 3

Груца І. А. Гісторыя пошукаў «скарбаў Напалеона» на р. Бярэзіне 8

Мацеюк В. П. Роль еўбюро пры ЦК КП(б)Б у паляпшэнні эканамічнага становішча яўрэйскага местачковага насельніцтва..... 13

Радаман А. А. Ухвалы соймікаў і шляхецкіх з'ездаў Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў сістэме нарматыўнага рэгулявання фінансавання соймавых паслоў у другой палове XVI — пачатку XVII ст. 16

Сувалаў А. М. Крытэрыі вызначэння этнічнай прыналежнасці беларусаў у славянскай гістарыяграфіі XIX — пачатку XX ст. 21

Мацюш П. А. Гістарычная адукацыя ў сістэме вышэйшай школы Беларусі (1959—1975 гг.): гістарыяграфія і крыніцы 24

Каспяровіч А. М. Выкладчыцкія кадры сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Савецкай Беларусі 20-х гг. XX ст. 27

Космач А. М. Кенэдзі і Югаславія: асноўныя напрамкі знешнепалітычных падыходаў 34

Філасофія

Патоцкі А. А. Асаблівасці інтэрпрэтацыі і разумення мастацкага тэксту ў постструктуралісцкай перспектыве 43

Красюк У. Ф. «Сфумата» Леанарда да Вінчы скрозь прызму метафізікі 46

Паліталогія

Ільін М. В. Механізм рэалізацыі кадравай палітыкі дзяржаўнай службы ў Рэспубліцы Беларусь 48

Гілеўская Л. П. Палітычныя тэхналогіі: падыходы, сутнасць, умовы ўжывання 52

Сацыялогія

Раманава С. П. Інавацыйныя тэхналогіі выкладання сацыялогіі 57

Новікава С. І. Фактары грамадзянскай сацыялізацыі моладзі 60

Князева К. І. Сетка як арганізацыйны прынцып 64

Эканоміка

Давыдзенка Л. М., Літвінюк А. І. Стратэгія ўваходжання Рэспублікі Беларусь у сістэму трансгранічных сусветнагаспадарчых сувязей 68

Анісько А. Г. Эмпірычная праверка трохкампанентнай мадэлі міжнароднага выбару прадпрымальніцкіх месц 76

Савіна А. Ф. Эвалюцыя мадэлей эканамічнага росту 82

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на паляпшаюць якасць адукацыі студэнтаў за кошт таго, што:

1) дазваляюць палепшыць якасць засваення новага матэрыялу, паглыбіць веды па сацыялогіі, зрабіць разнастайным працэс навучання;
2) дапамагаюць навучаць студэнтаў актыўным спосабам атрымання новых ведаў аб сацыяльнай рэальнасці, грамадскіх працэсах і з'явах;
3) садзейнічаюць выпрацоўцы ў навучэнцаў навукова абгрунтаваных уяўленняў аб прыродзе і дынаміцы сучасных сацыяльных працэсаў, узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці з'яў эканамічнага, палітычнага, духоўнага жыцця грамадства;
4) спрыяюць фарміраванню ў студэнтаў сацыяльна-псіхалагічнай устойлівасці да ўздзеяння розных стрэсавых сітуацый, характэрных для пераходнага грамадства;
5) даюць маладым людзям не толькі ўяўленні аб спосабах урэгулявання сацыяльных канфліктаў, але і навучаюць навыкам сацыяльнай дыягностыкі перадканфліктных сітуацый і ліквідацыі негатыўных перадумоў пэўных сацыяльных з'яў і працэсаў;
6) дапамагаюць асваенню асноў сацыяльнага прагназіравання;
7) прапаноўваюць студэнтам крытычны спосаб ацэнкі працэсаў, якія адбываюцца ў грамадстве, з выкарыстаннем рэзультатаў сацыялагічных даследаванняў.

Summary

The article describes non-traditional technologies of lecturing (lectures-essays, lectures-presentations) and seminars (problem groups, role games, debates) in sociology and carrying out of seminars in sociology.

УДК 316.614

С. І. Новікава

ФАКТАРЫ ГРАМАДЗЯНСКАЙ САЦЫЯЛІЗАЦЫІ МОЛАДЗІ

Праблема выхавання маладога пакалення ўключае складаная і шматгранная аспекты. Але ў значнай ступені станаўленне асобы яе паспяховасць залежаць ад таго, наколькі чалавек далучыўся да агульначалавечай і нацыянальнай культуры, авалодаў навыкамі супольнага жыцця, наколькі ён устойлівы да магчымых негатыўных праяў сацыяльнага асяроддзя.

Кожнае грамадства, кожная дзяржава ці сацыяльная група выпрацоўваюць на працягу сваёй гісторыі набор пазітыўных і негатыўных, фармальных і нефармальных санкцый, спосабаў унушэння і пераканання, прадпісанняў і забарон, мер заахвочвання і прымусу.

У Рэспубліцы Беларусь даволі шырока асвятляюцца пытанні грамадзянскай сацыялізацыі моладзі. Паняцце «грамадзянская сацыялізацыя» характарызуе працэс засваення кожным індывідам пэўнай сістэмы ведаў, норм, каштоўнасцей і традыцый, якія дазваляюць яму функцыяніраваць як паўнапраўнаму ўдзельніку грамадства.

Прафесійны, прававы і палітычны элементы вызначаюць сутнасць грамадзянскай сацыялізацыі. Прафесійная сацыялізацыя дазваляе маладому чалавеку набыць веды, асвоіць працоўныя навыкі ў адной або некалькіх прафесіях. Прававая — скіравана на пераадоленне ў маладзёжным асяроддзі прававога нігілізму, спрыяе ўсведамленню кожным маладым грамадзянінам сваіх правоў і абавязкаў. Палітычная сацыялізацыя спрыяе павышэнню актыўнасці кожнага індывіда ў абароне сваіх правоў і свабод, у кіраванні дзяржаўнымі і грамадскімі справамі.

Пытанне пра грамадзянскую сацыялізацыю моладзі, яе сутнасць актуалізуецца шэрагам акалічнасцей. Сусветная супольнасць, у першую чаргу, найбольш развітыя яе краіны, уступаюць у інфармацыйную цывілізацыю, іншыя дзяржавы знаходзяцца на яе парозе. У гэтых умовах, заснаваная на сіле і багацці, улада страчвае свой уплыў, хоць і не знікае цалкам. Мускульная сіла як спосаб атрымання багацця саступае суперсімвалічнай эканоміцы інфармацыйнага грамадства. Асаблівую каштоўнасць набываюць веды ў розным выглядзе — інфармацыя, навука, этыка, мастацтва. Яны фарміруюць маральныя якасці чалавека, яго грамадзянскую пазіцыю. Пра ролю ведаў у сучасным свеце сведчыць пашырэнне сярэдняй і вышэйшай адукацыі. За перыяд з 1960 па 1995 год колькасць людзей, ахопленых сярэдняй адукацыяй, павялічылася з 91 да 372 млн чал., а студэнтаў — з 13 да 82 млн.

У Рэспубліцы Беларусь за апошнія гады падчас рэфармавання сістэмы адукацыі шмат зроблена ў гэтым напрамку. Беларусь — у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адным шэрагу з развітымі краінамі Еўропы і Амерыкі ў галіне адукацыі: па ўзроўні пісьменнасці дарослага насельніцтва і моладзі, паказчыках паступлення дзяцей у пачатковую і сярэднюю школы, колькасці студэнтаў ВНУ. У прыватнасці, у сістэме школьнай адукацыі да 2008 г. павінен быць забяспечаны пераход агульнаадукацыйнай школы да 10-гадовай базавай абавязковай адукацыі, а да 2010 г.—да 12-гадовай поўнай сярэдняй адукацыі.

Да таго ж, паводле Глабальнай справаздачы ААН, Беларусь увайшла у групу краін з высокім узроўнем развіцця чалавечага патэнцыялу. Наша рэспубліка па-ранейшаму лідэр сярод дзяржаў СНД па індэксе чалавечага развіцця, які штогод падлічваюць эксперты ПРААН на аснове трох параметраў: чаканай працягласці жыцця, узроўню адукацыі і памеру валавага ўнутранага прадукту на душу насельніцтва. Як адзначаюць эксперты, гэта сведчанне дасягненняў Беларусі ў шматлікіх галінах, якія магчымы толькі пры дынамічным развіцці эканомікі. Рэспубліка захоўвае высокі ўзровень адукацыі, мае добра развітую сістэму сацыяльнага забеспячэння, дабілася пераканаўчых вынікаў у сферы занятасці насельніцтва.

Дынаміку развіццю эканомікі могуць надаць толькі адукаваныя людзі. На іх мы і арыентуемся. Нездарма таленавітая моладзь у нас падтрымліваецца на вышэйшым дзяржаўным узроўні. Па многіх дысцыплінах беларускія школьнікі, навучэнцы ПТВ і студэнты — пераможцы міжнародных алімпіяд. На іх рахунку — 40 залатых, 97 сярэбраных і 108 бронзавых медалёў. Такім чынам, пацвярджаецца высокі сусветны аўтарытэт айчыннай школы, як сярэдняй, так і вышэйшай.

У сістэме прафесійна-тэхнічнай адукацыі назіраецца больш цесная яе інтэграцыя з іншымі ступенямі адукацыі за кошт развіцця сеткі прафесійных ліцэяў і прафесійна-тэхнічных каледжаў. Ужо сёння трэцяя частка навучэнцаў сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі займаецца ў навучальных установах новага тыпу. Каля 70 % працэнтаў выпускнікоў атрымліваюць дзве і больш прафесій.

У сістэму вышэйшай адукацыі ўводзяцца новыя структуры — бакалаўрыят і магістратура. Укараняюцца сучасныя адукацыйныя тэхналогіі, прагрэсіўныя сродкі і дыстанцыйныя метады навучання. Удасканальваецца структура падрыхтоўкі спецыялістаў, у тым ліку з выкарыстаннем кантрактнай формы.

Беларусь удзельнічае ў Балонскім працэсе, скіраваным на дасягненне еўрапейскіх стандартаў у сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў. Яна прыняла на сябе абавязацельствы па выкананні Лісабонскай канвенцыі 1997 г. (Канвенцыя аб прызнанні кваліфікацый, якія адносяцца да вышэйшай адукацыі ў Еўрапейскім рэгіёне). Гэта ў перспектыве дапаможа вырашыць праблему прызнання беларускіх дыпломаў. Закранаючы тэму вышэйшай адукацыі, Прэзідэнт краіны А. Лукашэнка адзначыў, што не існуе адзінай універсітэцкай сістэмы для ўсіх народаў і што адукацыйная сістэма рэспублікі мае нацыянальныя асаблівасці. Ён перакананы, што «са сцен ВНУ павінны выходзіць не прафесійныя патрыёты, а патрыятычна падрыхтаваныя прафесіяналы».

Пераўтварэнні ў сістэме адукацыі ў выніку маюць на мэце далейшае ўдасканаленне выхаваўчай работы з навучэнскай моладдзю. Сучасная адукацыя пачынаецца з выхавання грамадзяніна і чалавека.

На выхаванне грамадзянскай сталасці навучэнскай моладзі, засваенне імі сваіх правоў і абавязкаў скіравана прававая і палітычная сацыялізацыя. У працэсе прававой сацыялізацыі навучэнцы атрымліваюць уяўленні пра дзяржаўнае ўладкаванне, палітычную сістэму грамадства, пра службу ва Узброеных Сілах краіны, пра падаткі, шлюбна-сямейныя адносіны. Даведваюцца аб прававых нормах і палітычных сістэмах. Гэта адбываецца як у працэсе навучаня, так і ў пазааўдыторны час, у паўсядзённым жыцці.

Сёння ва ўстановах адукацыі пытанні прававой сацыялізацыі, маральна-прававога выхавання навучэнскай моладзі рэалізуюцца дзякуючы зместу навучальнага працэсу і ўсёй выхаваўчай дзейнасці навучальных устаноў.

З мэтай авалодання навучэнцамі і студэнтамі асновамі прававых ведаў і выпрацоўкі ў іх навыкаў законапаслухмяных паводзін шырока выкарыстоўваюцца новыя вучэбныя праграмы, вучэбныя дапаможнікі. Так, у адпаведнасці з Загадам Міністэрства адукацыі ад 06.07. 1999 г. № 436 1 верасня 1999 г. уведзены Адукацыйны стандарт «Вышэйшая адукацыя. Цыкл сацыяльна-гуманітарных дысцыплін», ва ўсіх вышэйшых навучальных установах рэспублікі стаў выкладацца курс «Асновы права», склалася сістэма прававога інфармавання і выхавання навучэнскай моладзі.

Правасвядомасць моладзі — гэта грамадская, групавая і індывідуальная свядомасць. Яна адлюстроўвае прававую рэчаіснасць у форме юрыдычных ведаў, ацэначных адносін да права і практыкі яго прымянення, прававых установак і каштоўнасных арыентацый, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рэгулююць паводзіны чалавека ў юрыдычна значных сітуацыях.

Пры гэтым варта ўлічваць істотную розніцу ў правасвядомасці правапарушальнікаў і вучняў, якія не рабілі грамадска небяспечных дзеянняў, а таксама наяўнасць у дзяцей рознага ўзросту пэўных прававых ведаў і меркаванняў аб праве і практыцы яго прымянення. Чэрпаюцца яны з розных крыніц, узнікаюць у працэсе навучання, у стасунках з моладдзю старэйшага ўзросту, а таксама ў выніку назіранняў (да пэўных даступных меж) за дзейнасцю органаў аховы правапарадку, знаёмства з інфармацыяй, якая паступае праз СМІ, літаратуру, кінамастацтва, Інтэрнет. І хоць гэтыя прававыя веды, ацэнкі, як, дарэчы, і маральныя, яшчэ толькі фарміруюцца, іх наяўнасць пэўным чынам уплывае на паводзіны і самаацэнку маладых людзей.

Сацыёлагі высвятлялі, як адносіцца моладзь да непазбежнасці пакарання за злачынства. Тое, што пакаранне непазбежна, лічыць пераважная меншасць апытаных. Да якой жа высновы тут можна прыйсці? Такія прававыя арыентацыі абумоўлены, па-першае, практыкай безпакаранасці за здзейсненыя правапарушэнні, якая склалася ў некаторых установах адукацыі. Па-другое, звязаны з фармальным падыходам да выбару мер уздзеяння на правапарушальнікаў з улікам учыненых злачынстваў. Па-трэцяе, мае значэнне несвоечасовае прыняцце мер да правапарушальнікаў. І, нарэшце, тлумачыцца вядомымі дзецям выпадкамі беспакаранасці дарослых за розныя правапарушэнні.

У Рэспубліцы Беларусь работа па прававой сацыялізацыі моладзі будуецца дыферэнцыравана, з улікам асаблівасцей розных узроставых груп. Прававыя і палітычныя веды ў ВНУ выкладаюцца сістэматычна ў рамках дысцыплін: паліталогія, асновы права, правы чалавека, а зараз — і ў курсе «Асновы ідэалогіі Беларускай дзяржавы». У сярэдняй школе гэтыя веды даюцца не так шырока, як хацелася б. Элементы іх прысутнічаюць у дысцыпліне «Чалавек, грамадства, дзяржава». У большасці выпадкаў вучні заканчваюць школу малазнаёмымі з асновамі права. Некаторыя школы пераадольваюць гэты прабел увядзеннем факультатываў па прававой тэматыцы, пашыраюць пазакласную выхаваўчую работу мерапрыемствамі прававога характару. Ясна адно: неабходна ўзбраенне школьнікаў элементарнымі прававымі ведамі (у тым ліку аб дзяржаўнай сімволіцы), далучэнне іх да палітычных і прававых каштоўнасцей рознымі шляхамі, каб яны маглі на аснове атрыманых ведаў ажыццяўляць свой выбар правільна.

Нараўне з прававой у Беларусі паглыбляецца і ўдасканальваецца палітычная сацыялізацыя моладзі. Заўважым, што так можна гаварыць толькі ўмоўна, бо гэты працэс непадзельны.

Са студзеня 1997 г. у краіне ўведзена абавязковае вывучэнне ўсімі навучэнцамі і студэнтамі ўсіх тыпаў адукацыйных устаноў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. У нас склалася шматступеньчатая і разгалінаваная сістэма адукацыі ў галіне правоў чалавека і дэмакратыі. У 2000 г. Міністэрства адукацыі вызначыла новы змест адзінага спецыяльнага курса «Правы чалавека». Ва ўсіх навучальных установах (агульнаадукацыйных школах, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых) ён складаецца з трох раздзелаў: правы дзіцяці, правы чалавека, міжнароднае гуманітарнае права.

Важным напрамкам удасканалення выхаваўчай работы з навучэнскай моладдзю і дзяржаўнай палітыкі ў ідэалагічнай сферы становіцца палітычная сацыялізацыя. Сутнасць ідэалогіі беларускай дзяржавы вызначана ў адпаведнай канцэпцыі і выступленні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на нарадзе па праекце Указа «Аб сістэме дзяржаўных органаў і іншых арганізацый, якія ажыццяўляюць ідэалагічную работу», 13 жніўня 2003 г. Указам Прэзідэнта ад 20 лютага 2004 г. №111 «Аб удасканаленні кадравага забеспячэння ідэалагічнай работы» вызначана структура органаў і ўстаноў, закліканых забяспечваць гэты напрамак работы. Устаноўлена, што кіраўнікі дзяржаўных і іншых арганізацый краіны нясуць персанальную адказнасць за стан ідэалагічнай работы ў калектывах. Непасрэдная арганізацыя гэтай работы ўскладаецца на аднаго з намеснікаў кіраўніка. У поўнай меры гэтыя нормы Указа тычацца і ўстаноў адукацыі.

Установы адукацыі скарэкціравалі планы выхаваўчай работы з улікам задач ідэйна-палітычнага, маральнага, грамадзянскага выхавання і фарміравання здаровага ладу жыцця. Прыкладам можа служыць актывізацыя ідэалагічнай і інфармацыйна-прапагандысцкай работы сярод педагогаў, вучняў і іх бацькоў у навучальных установах г. Мінска. Калі першыя дзве акалічнасці тлумачаць важнасць праблемы грамадзянскай сацыялізацыі і характэрны для многіх дзяржаў сусветнай супольнасці, то трэцяя звязана з асаблівасцямі нашай дзяржавы. З аднаго боку, у савецкі перыяд былі разбураны і дэфармаваны тыя нешматлікія структуры грамадзянскай су-

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

польнасці: земствы, інстытуты міласэрнасці, саюзы прадпрымальнікаў, якія склаліся да рэвалюцыі. Толькі ў 90-я гг. XX ст. у працэсе рэфармавання савецкага грамадства намеціліся станоўчыя тэндэнцыі фарміравання грамадзянскага грамадства. Гэта звязана ў першую чаргу з пераацэнкай людзьмі сацыяльных каштоўнасцей, іх імкненнем пабудаваць прававую дзяржаву. З другога боку, сістэмны крызіс, які закрануў сучаснае грамадства ў сувязі з пераходам да рыначных адносін, патрабуе ад кожнага грамадзяніна, у першую чаргу маладога чалавека, іншага ўзроўню свядомасці, іншых мадэлей паводзін. А гэта дасягаецца навучаннем, выхаваннем, сацыялізацыяй асобы. Аснову каштоўнасцей сучаснага маладога чалавека складаюць дзелавітасць, ініцыятыва, прадпрымальнасць, імкненне да інавацый і пошук магчымасцей рэалізаваць свой творчы патэнцыял. Сацыяльныя інстытуты грамадства закліканы стварыць для маладых людзей магчымасці рэалізацыі здольнасцей, задаволіць іх матэрыяльныя і духоўныя патрэбы. У грамадзянскай сацыялізацыі моладзі вялікая адказнасць усіх сацыяльных інстытутаў, і асабліва адукацыйных устаноў, на якім узроўні яны ні знаходзіліся б.

Працэс рэфармавання адукацыі, які адбываецца ў Беларусі, па-новаму высвечвае праблему менавіта грамадзянскай сацыялізацыі моладзі. У гэтым плане заслугоўвае ўвагі думка В. А. Сухамлінскага пра тое, што ў моладзі трэба развіваць «грамадзянскія пачуцці», якія «ўзвышаюць чалавека, сцвярджаюць у ім грамадзянскую свядомасць, годнасць, гонар». Ён падкрэслівае, што ў маладых людзей варта развіваць «грамадзянскае бачанне свету», што «грамадзянскія пачуцці — галоўная крыніца маральнай чысціні».

Сёння ў Беларусі назіраецца тэндэнцыя «выспявання» элементаў сістэмы грамадзянскага выхавання. Адраджаюцца лепшыя традыцыі маладзёжнага грамадскага руху. У краіне зарэгістраваны звыш 60 дзіцячых і маладзёжных грамадскіх арганізацый. Установы адукацыі, вызначаючы непасрэдных партнёраў з ліку маладзёжных арганізацый з мэтай рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі, зыходзяць перш за ўсе з таго, наколькі іх дзейнасць адпавядае традыцыйным для нашага народа каштоўнасцям.

На такіх каштоўнасцях грунтуе сваю працу Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Колькасць яго членаў ва ўстановах адукацыі звыш 90 тыс. чалавек.

Грамадзянская сацыялізацыя моладзі падразумявае таксама мэтанакіраванае патрыятычнае выхаванне прадстаўнікоў гэтай сацыяльнай групы. Пазітыўныя вынікі прынесла работа падчас падрыхтоўкі і святкавання 60-годдзя вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Былі добраўпарадкаваны воінскія пахаванні, актывізавалася пошукавая работа па аднаўленні і ўшанаванні імёнаў невядомых воінаў і партызанаў.

Важны напрамак грамадзянскага выхавання ў такой поліэтнічнай дзяржаве, як Беларусь,— выхаванне ў моладзі культуры міжнацыянальных стасункаў. Сістэма адукацыі з «этнакультурным кампанентам» дапамагае ва ўмовах прамысловага мегаполісу наладзіць выкладанне нацыянальных моў, развіваць культуру нацыянальных супольнасцей, умацоўваць узаемаразуменне паміж моладдзю розных сацыяльна-этнічных супольнасцей, наладжваць сяброўскія адносіны паміж навучэнцамі і студэнтамі розных дзяржаў.

Праблема грамадзянскай сацыялізацыі моладзі як школьнай, так і універсітэцкай нямала. Трэба любымі шляхамі павышаць цікавасць моладзі да палітычных ведаў. Гэта могуць быць удзел у палітычным клубе, дэманстрацыя значэння палітычных ведаў, практыкум з выкарыстаннем камп'ютэрных праграм у мадэліраванні пэўных сітуацый. Гэтаму спрыяе сістэма патрыятычнага выхавання з выкарыстаннем дзяржаўнай сімволікі. У выніку наступствы яе ўплыву на асобу будуць мець вялікую сацыяльную каштоўнасць.

Адпаведныя фактары дзейнічаюць бесперапынна, на працягу ўсяго жыцця. Калі іх выкарыстаць усвядомлена, пры гэтым актыўна прапагандаваць дзяржаўную сімволіку, палітычная сацыялізацыя моладзі будзе куды больш плённай. Адна з важных умоў эфектыўнай дзейнасці сацыяльных структур і палітычных арганізацый — адэкватнае ўспрыманне людзьмі сваіх інтарэсаў і месца ў сістэме грамадскіх адносін.

Пры аналізе розных відаў дзейнасці адукацыйных устаноў па грамадзянскай сацыялізацыі моладзі можна зрабіць вывад пра яе пазітыўную ролю ў фарміраванні ў маладога чалавека комплексу такіх суб'ектыўных якасцей, як арыентацыя на агульнапрынятыя нормы і маральныя каштоўнасці грамадства ва ўсіх сферах, свядомая законапаслухмянасць, уменне адстойваць свае грамадзянскія правы і выконваць абавязкі, палітычная актыўнасць, адданасць Айчыне, культура як міжасобасных, так і міжнацыянальных, іншых сацыяльных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зносін, пастаяннае імкненне нарошчваць і рэалізаваць свой творчы патэнцыял на карысць грамадству.

Веданне і выкарыстанне педагогамі ўсіх фактараў грамадзянскай сацыялізацыі дазваляюць вызначаць і фарміраваць палітычныя прыярытэты і арыентацыі моладзі. Бо сістэма адукацыі, як сацыяльная сістэма, урэшце павінна сфарміраваць патрыятычна падрыхтаваных прафесіяналаў, здольных актыўна ўдзельнічаць у рэалізацыі прынятай у мінулым годзе Стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 года.

Літаратура

1. *Лисовский В. Т.* Молодежь о времени и о себе // Педагогика. 1998. № 4.
2. *Сергейчик С. И.* Факторы гражданской социализации учащейся молодежи. М., 2002.
3. *Сухомлинский В. А.* Рождение гражданина. М., 1977. С. 268.
4. Текущий архив Министерства образования Республики Беларусь. Справка «О политической и правовой социализации молодежи» от 21 марта 2004 г.

Summary

The problem of bringing up the younger generation is definitely a very complicated one. Belarus actively promotes the so called «civil socialization» of youngsters. «Civil socialization» possesses three essential aspects: professional, legal and political, each of them representing a respective social sphere. Despite obvious complexity of the issue Belarus has already devised a special «civil socialization» strategy ment to ensure the ultimate success of this ambitious undertaking.

УДК 316.35

К. І. Князева

СЕТКА ЯК АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПРЫНЦЫП

Рэаліі сучаснага жыцця — развіццё новых інфармацыйных тэхналогій, змена спосабаў вытворчасці, укараненне вытворчых адносін новага тыпу — непазбежна вядуць да змянення і пераўтварэння грамадскіх адносін. Традыцыйныя іерархічныя і бюракратычныя формы арганізацыі і кіравання ў многіх выпадках ужо не адпавядаюць узросшым патрабаванням да сучасных прадпрыемстваў адносна іх магчымасці да хуткіх змяненняў, навучання і мадэрнізацыі. Узнікае тэндэнцыя да з'яўлення новых арганізацыйных форм — сеткавых арганізацый, якія адрозніваюцца высокім дынамізмам і ніяк не адпавядаюць традыцыйнаму ўяўленню аб вытворчым прадпрыемстве. Для іх характэрны гібкасць, спецыялізацыя і акцэнт на кіраванне ўзаемаадносінамі і сувязямі, а не рыначнымі трансакцыямі [6].

У сувязі з гэтым мяняецца і роля сеткавай арганізацыі. Калі раней яна была адлюстраваннем толькі ўнутранай структуры працэсу кіравання, яго зместам, то ў навейшым светаўладкаванні яна адыгрывае ключавую ролю і становіцца свядома ўкараняемай формай арганізацыі кіравання. Найбольш відавочна гэты працэс адлюстраваны ў эканоміцы новага грамадства, якую ўсё часцей даследчыкі называюць «сеткавай эканомікай» [4—5; 7], у выглядзе рэарганізацыі структур сучасных прадпрыемстваў.

Сеткавая форма арганізацыі з'яўляецца натуральным фактарам эканамічнага і сацыяльнага асяроддзя і ўяўляе форму рыначнага ўзаемадзеяння гаспадарчых суб'ектаў, якая актыўна развіваецца. Гэтая форма існуе нараўне з іншымі арганізацыйнымі формамі і ўяўляе іншы механізм каардынацыі ў адрозненне ад іерархічнага.

У межах сацыялогіі вывучэнне феномена сеткавых арганізацый і працэсаў, якія адбываюцца ў іх, вызначаюць іх канкурэнтаздольнасць, вядзецца пераважна з пачатку 90 х гг. Развіццю дадзенага напрамку ў тэарэтычнай сацыялогіі ў большай ступені садзейнічала фундаментальная праца Мануэля Кастэльса, прафесара Каліфарнійскага універсітэта (Берклі, ЗША) і дырэктара Інстытута даследаванняў краін Заходняй Еўропы, «Інфармацыйная эпоха: эканоміка, грамадства, культура».

Пункт гледжання аўтара наступны. Сеткавыя адносіны, сеткавая арганізацыя грамадства існавала заўсёды, пры гэтым сеткавая арганізацыя дапаўняла рытуальную іерархічную. За апошнія 10—20 гадоў у эканоміцы і вытворчасці былі распрацаваны арганізацыйныя схемы, якія засноўваліся пераважна на сеткавых адносінах, а не на іерархічных. У многім гэта стала магчымым дзякуючы наступленню інфармацыйнай эпохі. Сеткавая арганізацыя больш мабільная, чым іерархічная, яна больш падыходзіць для адэкватнай апрацоўкі інфар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ